УДК 373.3.016:82.0
ББК 74.268.3
М 91

Аўтар:
*Н. У. Мурашка*, магістр, аспірант БДПУ імя М. Танка,
настаўнік пачатковых класаў вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі

Рэцэнзенты:
*Т. А. Шакун*, кандыдат педагагічных навук, загадчык кафедры менеджменту і адукацыйных тэхналогій Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі УА «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»
*М. У. Усціменка*, намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце ДУА «Пачатковая школа № 29 г. Мінска імя братоў Сянько»

На вокладцы малюнак:
аўтар: Красінская Дар'я, 10 год;
выкладчык: С. В. Кірнажыцкая

**Мурашка, Н. У.**
М 91 Фальклорная скарбонка: казачная гасцёўня : 2-гі клас : метадычны дапаможнік для настаўнікаў / Н. У. Мурашка. – Мінск : ІВЦ Мінфіна, 2024. – 100 с.
ISBN 978-985-880-477-0.

Дапаможнік змяшчае тэарэтычныя і практычныя матэрыялы для правядзення дадатковых (пазакласных) заняткаў з вучнямі І ступені агульнай сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання і выхавання ў форме факультатыўных заняткаў, аб'яднання па інтарэсах. Прадстаўленыя ў метадычным дапаможніку матэрыялы накіраваны на фарміраванне маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі ў вучняў праз вывучэнне фальклорных твораў. У выданні даны метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі працы з фальклорнымі творамі ў межах факультатыўных заняткаў «Фальклорная скарбонка: казачная гасцёўня».

Адрасаваны настаўнікам пачатковых класаў школ агульнай сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання і выхавання, намеснікам дырэктароў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі, выкладчыкам і студэнтам вышэйшых і спецыяльных навучальных устаноў спецыяльнасці «Пачатковая адукацыя».

**УДК 373.3.016:82.0**
**ББК 74.268.3**

**ISBN 978-985-880-477-0**

© Мурашка Н. У., 2024
© Афармленне.
УП «ІВЦ Мінфіна», 2024

folkskarbonka.by

**Змест**


Ад аўтара .......... 4

Тлумачальная запіска .......... 5

Прыкладнае тэматычнае планаванне .......... 8

Матэрыялы да заняткаў «Фальклорная скарбонка: казачная гасцёўня» .......... 8

Тэма: У госці да казкі .......... 8

Тэма: Беларуская народная казка «Коцік Петрык і Мышка» .......... 9

Тэма: Беларуская народная казка «Коцік, Пеўнік і Лісіца» .......... 12

Тэма: Беларуская народная казка «Пчала і муха» .......... 14

Тэма: Беларуская народная казка «Сынок з кулачок» .......... 16

Тэма: Прыйшла Каляда … .......... 18

Тэма: Беларуская народная казка «Як курачка пеўніка ратавала» .......... 21

Тэма: Беларуская народная казка «Зайчыкава хатка» .......... 23

Тэма: Беларуская народная казка «Пшанічны каласок» .......... 25

Тэма: Беларуская народная казка «Мена» .......... 29

Тэма: Вялікдзень .......... 31

Тэма: Падагульняльныя заняткі «Казачная гасцёўня» .......... 32

Тэма: Свята казкі .......... 32

Тэма: Купалле .......... 33

Прыкладныя планы да тэматычных заняткаў .......... 34

Прыкладны план заняткаў па тэме «У госці да казкі» .......... 34

Прыкладны план заняткаў па тэме «Прыйшла Каляда!» .......... 35

Прыкладны план заняткаў па тэме « Добры вечар таму, хто ў гэтым даму!!!» .......... 41

Прыкладны план заняткаў па тэме «Вялікдзень» .......... 45

Прыкладны план заняткаў па тэме «Купалле» .......... 49

Спіс выкарыстаных крыніц .......... 55

ДАДАТАК .......... 56

Заключэнне .......... 98


folkskarbonka.by

Прыказкі пра чалавечыя адносіны. Падзел казкі на часткі, складанне плана. Чытанне казкі па ролях. Падбор азначэнняў для герояў казкі. Творчая праца: стварэнне лялек «Петрыка» і «Мышкі» з бумагі.

Вуснае апавяданне пра герояў казкі. Чытанне тэксту па ролях з лялькамі. Інсцэніраванне ўрыўка казкі.

Матэрыялы для паўтарэння: скорагаворка, лічылка, гульня «Кошка і мышка».

***Матэрыялы да заняткаў***

*Скорагаворка:*

Смешкі кошцы, слёзцы мышцы.

*Змест казкі:*

**Коцік Петрык і Мышка**

*Беларуская народная казка*

Аднойчы захацеў коцік Петрык мышку злавіць. Дарослыя каты, бывала, расказвалі, як часта яны ловяць мышэй. І маленькі Петрык таксама захацеў вырасці, пачуўшы такое.

Пайшоў Петрык у гумно. Туды-сюды пахадзіў, нікога не ўбачыў. Але тут у куточку штосьці быццам зашамацела… Петрык узрадаваўся і адразу скокнуў туды. Перад ім стаяў маленькі звярок.

- Хто ты? – запытаўся коцік.
- Я – Мышка.
- Ты мне якраз і патрэбная.
- Для чаго?
- Я не ведаю для чаго, але каты павінны лавіць мышей.

Тут Мышка зусім асмялела і кажа:

- Ведаеш, навошта каты мышэй ловяць? Каб гуляць з імі ў кошкі-мышкі. Магу навучыць цябе! Хочаш?
- Так, - адказаў коцік Петрык.
- Станавіся ў куток, заплюшчвай вочы і пачынай лічыць. Калі далічыш да трох – лаві мяне!

Гульня Петрыку спадабалася. Стаў ён у куток, вочы заплюшчыў… А калі далічыў да трох, Мышкі ўжо і след прастыў [3, с. 11–12].

*Прыказкі і прымаўкі:*

З кім павядзешся, ад таго і набярэшся [5, с. 32].

Гэты Яўхім і з вады вылезе сухім [4, с. 297].

Кошка мышцы не таварыш [4, с. 304].

*Загадкі:*

Лёг вусаты, устаў гарбаты. (Кот) [4, с. 307].

Па хаце ходзіць, шастом водзіць. (Кот) [4, с. 308].

Маленькія лапкі, на лапках царапкі, мякка ступае ды мышак пужае. (Кот) [5, с. 16].

Маленькі шарык пад лаўкай шарыць, збірае крошкі, баіцца кошкі. (Мышка) [4, с. 306].

folkskarbonka.by

Па хатах хадзілі калядоўшчыкі (слайд 9, малюнак 15). Гэта пераапранутая моладзь. Гаспадары частавалі іх. Часцей за ўсё гэта былі арэхі, пернікі і печыва, пазней – цукеркі.




Малюнак 15. – Фрагмент прэзентацыі «Прыйшла Каляда!». Слайд 9

А яшчэ на Каляды абавязкова варажылі (прадказвалі будучыню). Кідалі на дарогу чаравікі, пыталіся імёны, лілі воск у сцюдзёную ваду (слайд 10, малюнак 16).




Малюнак 16. – Фрагмент прэзентацыі «Прыйшла Каляда!». Слайд 10

Пазней Каляды аб’ядналі з рэлігійным святам Раства Хрыстова і крыху змянілі на царкоўны лад. Але магічны сэнс свята, багаты стол, падарункі, паходы ў госці адзін да аднаго, маскарад так і засталіся з намі па сённяшні дзень (слайд 11, малюнак 17).




Малюнак 17. – Фрагмент прэзентацыі «Прыйшла Каляда!». Слайд 11

*Фізкультхвілінка:*

Танцавальныя рухі пад калядную песню «Ой, чок-чок-чок»

*(Знайсці песню можна па спасылцы:*

*https://www.youtube.com/watch?v=76x5KcRHSJU)*

***Асноўная частка***

- Вы так уважліва слухалі мяне, а цяпер раскажыце мне як рыхтаваліся да Каляд?

folkskarbonka.by

**ДАДАТАК 2**

**Раздатачны матэрыял да заняткаў «Беларуская народная казка «Коцік Пеўнік і Лісіца»**

***Размалёўкі для калажу***





folkskarbonka.by

**ДАДАТАК 12**

## Раздатачны матэрыял да тэматычных заняткаў

## «Добры вечар таму, хто ў гэтым даму!!!»

### *Буклет для вучняў «Добры вечар таму…»*

**Тэматычныя заняткі**
**«Добры вечар таму, хто ў гэтым даму!»**

***Мэта*** – пазнаёміцца з традыцыяй калядавання.

***Задачы:***

- даведацца хто такія калядоўшчыкі;
- вызначыць чым яны займаліся.

**Заданне:** Прачытай расказ пра Каляды і раскажы бацькам і сябрам.

«Калядаванне» – адна з самых яркіх традыцый, якая дайшла да нас. Моладзь



збіралася разам, пераапраналася ў жывёл (мядзведзя, казу, карову, каня, бусла) і хадзіла па хатах.

Калядоўшчыкі спявалі калядныя песні, жадалі ўсяго лепшага, ігралі на музычных інструментах.



Часцей калядоўшчыкі прыходзілі з «казой». Каза скакала, «калола» прысутных рагамі, а ў канцы песні падала і «паміра̀ла».

Гаспадары давалі ў падзяку «казе» розныя прысмакі. Адмовіць калядоўшчыкам у пачастунках пазбавіць поспеху на ўвесь наступны год.





Пасля калядоўшчыкі збіраліся ў адным месцы, з'ядалі падарункі, пелі песні ды вадзілі карагоды.

---

Так заканчвалася самае вясёлае і любімае свята.

**Заданне:** Разгадай красворд.

**Красворд**



1. Як называлася жывёла, з якой звычайна хадзілі калядоўшчыкі?
2. Колькі тыдняў працягваліся Каляды?
3. Як называлі моладзь, якая хадзіла па хатах?
4. Як называлася галоўная калядная страва?
5. Што давалі гаспадары калядоўшчыкам?
6. Як называліся танцы, якія выконвалі на Каляды?

***Дзякую за актыўны ўдзел***
***і сумесную працу!***

**ТЭМАТЫЧНЫЯ ЗАНЯТКІ**

**«ДОБРЫ ВЕЧАР ТАМУ, ХТО Ў ГЭТЫМ ДАМУ!»**



Распрацавалі:
Мурашка Н.У., аспірант БДПУ імя М. Танка, магістр
Шылава А.С., кандыдат педагагічных навук, дацэнт,

folkskarbonka.by